*сательном круге*, *на лисьем меху – снежинки блестят на мехе, сидеть на мысу реки – на мысе Дежнёва*, *весь в поту – трудиться в поте лица*, *в ряду передовиков – в ряде фирм*, *на хорошем счету – на расчётном счёте*, *стоять в углу – в угле треугольника*, *машина на ходу – отразиться на ходе дела*, *товар в ходу – перебои в ходе часов*, *сад в вету – во цвете лет*. Делалось замечание относительно слова *снег*: при наличии определения вместо формы на *-у* допускается форма на *-е*, например: *в снегу – в пушистом снеге*.

Использование словоформы *по приезду* верно в дательном падеже. Значение дательного падежа (аллатива) проявляется в направленности, т. е. он управляется глаголами действия, направленного к предмету («действие в пользу кого-нибудь»). Отсюда и его название, от *дать*, *передать*. Правильно употребляется дательный с предлогом *по* в контексте: *по чему?* (*в соответствии с чем?*), например, *По приезду командира стало ясно, что в части кому-то не поздоровится*.

Заметим, что обе формы и дательного направительного, и предложного темпорального (временного) нечасто встречаются в медиаречи. Для последней возможна замена – *после приезда*, *когда приехал*. И хотя в наше время медиаречь уходит от книжности, «высокости» (а разграничение форм *по приезде* и *по приезду* можно к ней отнести ☺), соблюдение морфологической нормы – неукоснительное требование к профессиональной деятельности журналиста (и особенно) районной газеты, которая формирует речевые вкусы аудитории, воспитывает её и просвещает.

**Арцём Кавалеўскі**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

## ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА ЯК КУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН У РАЁННАЙ ГАЗЕЦЕ

Рэгіянальны газетны тэкст (а тым больш мастацкі) уяўляе сабой феномен, у якім спалучаюцца агульнанацыянальныя і мясцовыя складнікі ў адносінах як да зместу, так і да моўнай формы яго выяўлення. Ва ўмовах кансалідацыі сучаснага беларускага грамадства рэгіянальныя друкаваныя СМІ павялічваюць аб’яднаўчую функцыю: у масмедыя кожнага рэгіёна, якія прэтэндуюць на пэўную долю самастойнасці і рэальна ёй валодаюць, назіраюцца культурастваральныя тэндэнцыі, асабліва ў галіне прадстаўлення мастацкіх тэкстаў, прысвечаных апяванню малой радзімы аўтараў. На гэтым фоне беларуская мова выступае як гарант

адзінства дзяржавы, і таму сёння асабліва актуальным робіцца вывучэнне рэгіянальных тэкстаў, прадстаўленых, у тым ліку, і на літаратурных старонках раённых газет.

Напрыклад, літаратурнаму аб’яднанню пры раённай газеце «Полымя» ў Карэлічах Гродзенскай вобласці споўнілася 55 гадоў. 55 гадоў таму пры раённай газеце «Полымя» пачало дзейнічаць літаратурнае аб’яднанне «Рэчанька», у радах якога сёння аб’яднаны два дзясяткі мясцовых аўтараў. Яны пішуць і дасылаюць свае вершаваныя радкі на адрас раёнкі, у якой штомесячна публікуецца літаратурная старонка «Рэчанька».

Адно з пасяджэнняў літаб’яднання было праведзена сумесна з аматарамі клуба «Пасядзім па-харошаму», які дзейнічае пры Карэліцкім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці. Такім чынам мясцовыя паэты мелі магчымасць наладзіць стасункі з удзельнікамі хору ветэранаў раёна. Ганаровымі гасцямі свята сталі начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і справах моладзі райвыканкама Іна Міхайлаўна Санчук, клірык храма святых апосталаў Пятра і Паўла г. п. Карэлічы Георгій Шаўчэнка, кіраўнік літаратурнага аб’яднання «Рэчанька» пры раённай газеце «Полымя» Галіна Паўлаўна Калтунова. На вечарыне гучалі вершы мясцовых аўтараў, песні ў выкананні ўдзельнікаў хору ветэранаў раёна. Не абышлося, вядома, і без танцаў, у якіх нашым пенсіянерам роўных няма.

Даследчыкі літаратуры ў шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя называюць залатым часам для літаратурнага працэсу Маларытчыны. Сапраўды, такога суквецця талентаў, як Яраслаў Пархута, Мікола Купрэеў, Аляксей Філатаў, Сцяпан Крываль, на тэрыторыі раёна больш, на жаль, доўгі час не назіралася. Затым для літаратурнага руху рэгіёна быў характэрны пэўны спад. Настаў зацішак.

Мясцовыя пісьменнікі разумелі, што для прапаганды мастацкага слова неабходна, каб была створана зваротная сувязь з чытачом. Для гэтай мэты і задумваўся выпуск тэматычнай літаратурнай старонкі. Намаганнямі ў першую чаргу Сцяпана Крываля 12 кастрычніка 1960 г. яна ўсё ж такі з’явілася ў раённай газеце «Сцяг Перамогі». Тут былі змешчаны вершы І. Мельнічука, В. Жуковіча, І. Сцяпанава, нарыс С. Крываля. На працягу наступных 15 гадоў літаратурная старонка з’яўлялася не вельмі часта. Рэдакцыя газеты больш змяшчала ў асобных нумарах па 2-3 вершы пад рубрыкай «Літаратурны куток». Сітуацыя змянілася ў 1975 г. З гэтага года чытачы мелі магчымасць з літаратурнай творчасцю мясцовых пісьменнікаў знаёміцца пастаянна (4-7 разоў на

год). 15 лютага 1975 г. на тэматычнай падборцы было пазначана, што гэта – выпуск літаратурнага аб’яднання «Каласок». У 1979 г. старонка называлася «Хвалі Рыты», у 1981 г. – «На хвалях Рыты», у 1988 г. – «Над рэчанькай Рытай».

5 мая 1988 г. «раёнка» паведаміла, што на чарговым пасяджэнні літаратурнага аб’яднання пры газеце «Сельскае жыццё» абраны новы яго кіраўнік. Ім стаў Сямён Кавенька. Першым жа яго старшынёй быў Сцяпан Крываль. Але ў сувязі з падрыхтоўкай да друку свайго першага зборніка апавяданняў, пісьменнік выказаў просьбу аб перавыбранні. Трэцяга верасня пры рэдакцыі газеты «Голас часу» афіцыйна аформлена літаратурнае аб’яднанне «Над рэчанькай Рытай». Сямён Іванавіч яго ўзначальваў да 2012 г. З 2012 г. ім кіруе Мікалай Пацяюк (член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2013 г.). З прыходам Мікалая Іванавіча актывізаваўся выпуск тэматычнай старонкі. За 2014 г., напрыклад, іх выйшла 14.

Няправільна будзе сказаць, што паэтычныя творы да гэтага ў раённай газеце не друкаваліся. Але са стварэннем літаб’яднання, самым шчырым і добра зычлівым прыхільнікам якога выступіў тады былы галоўны рэдактар Уладзімір Захарэвіч, сувязь з аўтарамі стала больш сістэматычнай і цеснай.

Разам з вядомымі прозвішчамі майстроў пяра Маларытчыны, такімі, як Мікалай Пацяюк, Уладзімір Данілюк, Генадзь Мішчук, Уладзімір Кучмінскі, у выпусках літаратурнага аб’яднання «Над рэчанькай Рытай» на старонках газеты «Голас часу» з’яўляюцца і новыя. Чытачоў сваімі творамі радуюць Таццяна Ефлакова, Надзея Кухцей, Валянціна Бярнадская, Алёна Сац, Тамара Марозава, Пётр Пальчук і інш.

Важнае месца для пашырэння творчасці мясцовых пісьменнікаў займае дзейнасць бібліятэк. Шмат у гэтым накірунку ўжо зроблена аддзелам бібліятэчнага маркетынгу Маларыцкай ЦБС (загадчык Галіна Кучына). Пачынаючы з 1996 г., свет убачылі ўжо 33 зборнікі майстроў пяра. Сваімі вершамі за гэты час чытачоў парадавалі: Аляксандр Ізбіцкі (5 зборнікаў), Мікалай Губей (4), Лідзія Гаўрылюк (4), Генадзь Мішчук (2), Міхаіл Коцелеў (2), Пётр Чагайда (2), а таксама – Уладзімір Данілюк, Іван Заматаеў, ЛідзіяКівачук, Алена Мажароўская, Вольга Бачай, Ніна Надзяжук, Дзіяна Нікалаюк, Мікалай Пацяюк і інш. Маларыцкая ЦБС выдала і 2 калектыўныя зборнікі: «Ад саракпятага да нас». Паэты Маларытчыны пра вайну (вершы У. Данілюка, П. Чагайды, І. Заматаева, А. Ізбіцкага, С. Кавенькі) і «Млечнасць зорак» (вершы Таццяны Трыханюк, Людмілы Ардэмасавай, Дзіяны Нікалаюк,

Валянціны Астапук). За апошні час аддзел бібліятэчнага маркетынгу выдаў яшчэ 3 паэтычныя зборнікі мясцовых паэтаў: Мікалая Губея «На парозе вечнасці», Васіля Стасюка «Дорога до Домы» (вершы напісаны на дыялекце в. Лукава) і ГенадзяМішчука «Ля клёнаў і бяроз».

У літаратурным працэсе Маларытчыны апошняга часу назіраецца і яшчэ адна станоўчая тэндэнцыя – пачала развівацца літаратурная крытыка. Даследаваннямі творчасці мясцовых паэтаў стала актыўна займацца Марыя Жыгалава, доктар педагагічных навук, прафесар Брэсцкага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, сапраўдны член Акадэміі педагагічных і сацыяльных навук РФ. Марыя Пятроўна ўжо надрукавала некалькі сваіх навуковых прац на гэтую тэму. Краязнаўчыя нарысы і артыкулы пра пісьменнікаў Маларытчыны, іх творы напісаны таксама і брэсцкімі навукоўцамі – Верай Ляшук, Галінай Снітко і Валянцінам Смалем. Пад кіраўніцтвам Ірыны Аксянюк, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры раённай гімназіі, падрыхтавана вучнёўская даследчая работа «Тэма Радзімы ў творчасці беларускамоўных паэтаў Маларытчыны».

Аб вартасці твораў пісьменнікаў раёна сведчыць і той факт, што іх вершы, апавяданні змяшчаліся і змяшчаюцца на старонках абласных газет «Заря» і «Народная трыбуна», у выпусках літаратурнага альманаха «Жырандоля» Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў, рэспубліканскай газеты «Звязда», часопіса «Маладосць» і інш. А Генадзь Мішчук у 2003 г. заняў ІІІ месца ў рэспубліканскім конкурсе апавяданняў, які праводзіла рэдакцыя газеты «Звязда» сумесна з ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».

**Ольга Касперович-Рынкевич**
*Белорусский государственный университет (г. Минск, Беларусь)*

## МУЛЬТИМЕДИЙНЫЕ ФОРМАТЫ В ИНТЕРНЕТ-ВЕРСИЯХ ОБЛАСТНЫХ ГАЗЕТ БЕЛАРУСИ

Глобальная трансформация производства медиаконтента привела к увеличению воспринимаемой информации. Все реже общество может позволить себе вдумчивое и неторопливое чтение газет и журналов. Вместо этого мы получаем информацию, используя десктопы и мобильные устройства. При этом пользователи не любят слишком тяжелый контент [3, с. 143] в двух проявлениях: полотно текста и мультимедиа с долгой загрузкой. Российский исследователь С. И. Симаков утверждает, что «визуализация журналистского контента в СМИ – наиболее эффек-